*І. І. Бамбешка*

# МУЗЕЙ У ДУХОЎНЫМ ЖЫЦЦІ ГРАМАДСТВА Ў ПАЧАТКУ XXI ст.

Сённяшняя сацыякультурная сітуацыя характарызуецца шэрагам пазітыўных і негатыўных рыс. Сярод першых можна назваць акцэнтаванае значэнне чалавечай індывідуальнасці, свабоду слова і асабістых арыентацый, разнастайнасць формаў культурнага жыцця, пашырэнне міжкультурных сувязей і актывізацыю працэсаў узаемаўплываў і ўзаемаўзбагачэння культур. Разам з тым можна канстатаваць паглыбленне маёмаснай і сацыяльнай няроўнасці, узмацненне ахоўнага прагматызму, з’яўленне дэінтэлектуалізацыі [1].

Асаблівасць сучаснага сацыякультурнага развіцця заключаецца яшчэ і ў тым, што ўсе вышэйпералічаныя асноўныя тэндэнцыі фарміруюцца пад уплывам інавацыйнага камунікатыўнага асяроддзя. Імклівае развіццё інфармацыйных (відэакамп’ютарных) тэхналогій, якія выступаюць у ролі адной з дамінантных інавацыйных тэндэнцый, абазначыла канфлікт паміж культурай – у яе традыцыйнай кніжна-пісьмовай форме – і цывілізацыяй, якая разумеецца як узровень сучаснага матэрыяльна-тэхнічнага развіцця. У гэтым канфлікце вытворча-тэхнічныя працэсы і тэхналогіі вельмі часта ўспрымаюцца як абязлічаныя і абяздушаныя сілы, якія пад відам фарміравання глабальнага інфармацыйнага грамадства пагражаюць ператварыць чалавека ў прыдатак машыны, што супярэчыць яго біясацыяльнай прыродзе [2, с.158].

Натуральна, што вырашэнне праблемы выжывання чалавецтва залежыць ад таго, наколькі яно зможа зразумець небяспеку некантралюемага развіцця тэхналогій і падпарадкаваць іх задачам духоўна-арыентаванай культуры, закліканай быць універсальным механізмам самаарганізацыі жыцця грамадства і прасторай рэалізацыі сутнасных якасцей асобы. Вялікае значэнне тут мае ўзровень развіцця адукацыі і характар адносін да спадчыны. Ідэальнай формай увасаблення традыцыі як «спосабу захавання чалавечага вымярэння рэальнасці» з’яўляецца музей. Музеі заўжды былі цэнтрамі захавання гістарычнай памяці, культурных традыцый і пераемнасці пакаленняў. Музей як поліфункцыянальны цэнтр духоўнага жыцця грамадства інтэгруе каштоўнасці сусветнай і айчыннай культуры. Захоўваючы матэрыялізаваныя сведчанні з’яў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэсаў прыроды, ён перадае пакаленням эстафету культуры, якая знаходзіцца ў стане бесперапыннага станаўлення. Цяперашняя прыцягальнасць гэтага самага ўстойлівага інстытута захавання культуры вызначаецца тым, што музей захоўвае і прад'яўляе чалавеку матэрыялізаваныя сведчанні развіцця прыроды і факты яго ўласных творчых дасягненняў, падкрэсліваючы тым самым важнасць сістэмы сувязей чалавека са светам ва ўсім іх багацці, разнастайнасці і супярэчнасцях [5, с.39].

Як паказвае гістарычны рэтраспектыўны аналіз развіцця музейнай справы ў свеце, рост грамадскай цікавасці да музея і фарміраванне яго інстытуцыяльнай ролі прыходзіцца на другую палову XIX ст. Менавіта тады ясна выявілася цесная сувязь развіцця музейнай справы з поспехамі ў развіцці прамысловасці. На сёння гэтая сувязь актуальная перш за ўсё ў галіне відэакамп'ютарных тэхналогій, якія шмат у чым абумовілі пераход да інфармацыйнага грамадства [3, с.128].

У канцы XIX – пачатку XX ст. фарміруецца новы кірунак музейнай дзейнасці, які развівае магчымасці музея як канала культурнай камунікацыі. Адначасова ўзнікае і зацвярджаецца канцэпцыя музея як асветнай установы [4, с.186].

Адной з прыкмет «гуманітарнай» рэакцыі на наступленне «тэхнасу» з'яўляецца рост колькасці музеяў у канцы XX ст. Звыш 90% іх узніклі ў такіх высокаразвітых у прамыслова-тэхнічных адносінах краінах, як ЗША, Англія і інш. [3, с.142, 144–145]. Запатрабаванасць музея грамадствам – паказчык усведамлення чалавецтвам месца культуры і мастацтва ў жыцці, а таксама неабходнасці арыентавацца на высокія духоўныя мэты ў працэсе сацыяльна-эканамічнай дзейнасці.

Паглыбленне ўзаемадзеяння музея і грамадства – адлюстраванне тэндэнцыі да інтэграцыі разнастайных галін ведаў [7, с.316]. Як паказала практыка, уключанасць музея ў агульнаадукацыйны працэс садзейнічае фарміраванню псіхалагічнай і маральнай падрыхтаванасці чалавека не толькі да жыцця ў імкліва пераменлівым свеце, але і быць суб'ектам сацыякультурных утварэнняў, якія ў ім адбываюцца. Іншымі словамі, ідзе размова аб творчай асобе, якая, засвоіўшы тэкст гуманітарнай культуры, здольна інтэрпрэтаваць яго ў кантэксце ўласнай культуры. У дыялагічнай прасторы музея маецца магчымасць нанова пражыць адлюстраваныя ў помніках культуры і мастацтва з'явы і падзеі знешняга і ўнутранага жыцця чалавека [3, с.146].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уключаючыся ў духоўнае жыццё грамадства, музей пашырае свае функцыі. Захоўваючы і экспануючы помнікі гісторыі і культуры, сучасны музей вырашае актуальныя задачы грамадскага развіцця. Музей вымушае наведвальнікаў пераасэнсаваць мінулае, ацаніць эканамічныя, ваенныя, навуковыя, побытавыя дасягненні продкаў, зразумець вытокі, прыроду і значнасць найбольш яркіх з'яў у гісторыі і культуры. Музей тым самым удзельнічае ў фарміраванні нацыянальнай ідэі, садзейнічае станаўленню патрыятычных пачуццяў, актыўна ўздзейнічае на працэсы захавання і далейшага ўзбагачэння нацыянальна-культурных традыцый. Сучасны музей як сфарміраваны культураахоўны інстытут прымае на сябе і культураўтваральную функцыю, і ў гэтым выяўляецца важнейшая тэндэнцыя развіцця музейнай справы ў пачатку XXI ст.

Інфармацыйны рэсурс музеяў XXI ст. аб'ядноўвае мінулае і сённяшняе, інтэгруе ўсю разнастайнасць эканамічнага, палітычнага і грамадскага жыцця, носіць міждысцыплінарны характар. Адлюстроўваючы прыродны і сацыяльны бок быцця, музей задавальняе патрэбы прыродазнаўчых і гуманітарных дысцыплін.

Пераўтварэнне музейных устаноў у цэнтры духоўнага жыцця грамадства – гэта заканамерная тэндэнцыя іх развіцця ў XXI ст., натуральная рэакцыя на патрэбы грамадства ў захаванні, эфектыўным выкарыстанні і ўзнаўленні гісторыка-культурнай спадчыны, без якой немагчымы працэсы адукацыі і выхавання, актывізацыі духоўнага жыцця краіны.

Арыентацыя на агульнапедагагічныя задачы развіцця, выхавання і адукацыі аб'яднала самыя розныя па маштабах і спецыфіцы калекцыі музея. На сёння музейныя супрацоўнікі, імкнучыся выпрацаваць у падрастаючага пакалення патрэбу у зносінах са светам прыроды, гістарычнай спадчынай і творчым самавыяўленні, усё часцей сумяшчаюць асноўную работу з працай школьнага настаўніка, авалодваючы яго прафесійнымі навыкамі. Тым самым яны актыўна ўдзельнічаюць у працэсе мадэрнізацыі айчыннай адукацыі, мэта якой – фарміраванне цэласнай, тэхнічна і эстэтычна развітой асобы, здольнай забяспечыць пазітыўнае ў духоўным плане і дынамічнае развіццё цывілізацыі [6, с.95].

1. *Мастеница, Е. Н.* Музей в современной социокультурной ситуации / Е. Н. Мастеница // Современный музей как важный ресурс развития города и региона: тезисы Междунар. науч.-практ. конф., Казань, 12–17 сент. 2005 г. [Электронный рэсурс]. – 2005. – Режим доступа:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

http://www.bvahan.com/museologypro/muzeevedenie.asp?li2=1&ctext=18. – Дата доступа: 25.02.2011.

2. *Музалевская, И. М.* Социокультурное предназначение современного музея / И. М. Музалевская // Музей в социокультурных реалиях: материалы XXV науч.-методол. семинара, Москва, 10 апр. 2008 г. / под общ. ред. В. К. Егорова, О. Н. Астафьевой. – М., 2008. – С. 157–165.

3. *Основы* музееведения: учеб. пособие / отв. ред. Э. А. Шулепова. – М.: ЕдиториалУРСС, 2005. – 504 с.

4. *Сотникова, С. И.* Музеелогия: пособие для вузов / С. И. Сотникова. – М.: Дрофа, 2004. – 192 с.

5. *Столяров, Б. А.* Музей в пространстве художественной культуры и образования: учеб. пособие / Б. А. Столяров. – СПб.: [Б. и.], 2007. – 216 с.

6. *Столяров, Б. А.* Музейная педагогика. История, теория, практика: учеб. пособие / Б. А. Столяров. – М.: Высш. шк., 2004. – 216 с.

7. *Юренева, Т. Ю.* Музееведение: учебник для высш. шк. / Т. Ю. Юренева. – М.: Академический проект, 2003. – 558 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ